Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

цу?», «Когда придет конец? Что об этом сказал Иисус Христос», «Как попасть в новый мир», «Каким будет новый мир?».

В разделе «Идет ли этот мир к концу?» на основе ссылок на библейские тексты утверждается, что в «конце этого мира» исчезнут не человечество и планета Земля, а «проблемы и беззаконие». Установится «Царство Бога» – «мировое правительство», которое «лишит власти все человеческие правительства», «возьмет правление в свои руки» и «будет править с неба». Надежды на небесное «мировое правительство» Свидетели Иеговы обосновывают несовершенством человечества, а «Царство Бога» мыслят, как «единственное правительство, которое в силах раз и навсегда покончить со всеми глобальными проблемами» [3, с. 4-6]. В разделе «Когда придет конец? Что об этом сказал Иисус Христос» утверждается, с цитированием Библии, что наступление конца мира было предсказано Иисусом Христом, и приводятся «доказательства» наступления «последних дней» (войны, голод, землетрясения, череда болезней и эпидемий, включая COVID-19) [3, с. 7-9]. Тем не менее, пророчество Иисуса о конце этого мира, по мнению иеговизма, «вселяет надежду». В разделе «Как попасть в новый мир» залогом будущего спасения признается «хорошее знание Бога», каждодневное чтение Библии, обращение с просьбами о помощи у Бога. Это должно обеспечить жизнь в «новом мире Бога» [3, с. 10-12]. И, наконец, в разделе «Каким будет новый мир?» раскрываются иеговистские представления о будущей планете, населенной «верными Богу людьми». Всем человечеством будет править с небес новое «правительство Бога» («мировое правительство»), все жители Земли будут любить Бога и друг друга, и заботиться о своем общем доме – планете Земля («международное единство»), Творец восстановит климатическое равновесие и утраченную гармонию между человеком и природой («гармония с природой»). Атрибутами нового мира станут также «идеальное здоровье», «много еды для всех», «настоящий мир и безопасность», «красивые дома и интересная работа для всех», «самое лучшее образование», и эта «жизнь будет длиться вечно» [3, с. 13-15].

## Литература

1. Свидетели Иеговы / Watch Tower Bible and Tract Society of Pennsylvania [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.jw.org/ru/. – Дата доступа: 1.02.2022.

2. Священное Писание. Перевод нового мира. – New York : Watchtower Bible and Tract Society of New York, 2007 – 1788 с.

3. Сторожевая башня возвещает Царство Иеговы. – 2021. – № 2. – 16 с.

4. Человечество в поисках Бога. – New York : Watchtower Bible and Tract Society of New York, 2006 – 384 с., ил.

УДК 930.2:27

# МАТЭРЫЯЛЫ АСОБНЫХ ГАЛІН ОРДЭНУ КАРМЕЛІТАЎ У ФОНДАХ ЦНБ НАН БЕЛАРУСІ

**Сыцько Кірыл Валер’евіч**
Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

*У тэксце разглядаюцца матэрыялы з беларускіх кляштараў Ордэну кармелітаў, якія трапілі на захаванне ў Цэнтральную навуковую бібліятэку імя*



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

*Я. Коласа. Робіцца спроба адсачыць шлях дадзеных матэрыялаў у бібліятэку, апісваецца іх каштоўнасць як гістарычных крыніц, прыводзяцца іншыя месцы захавання некаторых дакументаў, якія разам з названым комплексам складаюць адзінае інфармацыйнае поле.*

У фондзе 23 Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі захоўваецца вялікі пласт гістарычных крыніц, не звязаных паміж сабой роднаснымі правеньентнымі сувязямі і, у большай ступені, апісаны і скампліляваны ў вопісе спарадычна. Адным з нешматлікіх упарадкаваных па прынцыпе паходжання кавалкаў названага фонду з’яўляецца сукупнасць матэрыялаў, створаных рознымі галінамі Ордэну кармелітаў на тэрыторыі ВКЛ, а пазней і беларусска-літоўскіх губерняў Расійскай імперыі.

Дадзены комплекс дакументаў, якія паходзяць з пакармеліцкіх кляштараў, налічвае 79 адзінак захавання і храналагічна ахоплівае 1759–1842 гг. Выключная большасць матэрыялаў належыць кармелітам босым (O.C.D., Carmelitae Discalceati), дзевяць адзінак захавання створана галіной кармелітаў чаравічковых (O.Carm., Carmelitae Calceati), пазначаных у вопісе пад назвай «кармеліты старых правіл». Тэрытарыяльна калекцыя ахапіла наступныя кляштары: засвірскі, пінскі, старамядзельскі, анталепскі, лінкаўскі, чавусскі, бялыніцкі, слабодскі, пашэменскі, гудагайскі, гродзенскі, глыбоцкі, хвалонскі, ковенскі, віленскі. Таксама ў зборы бібліятэкі трапілі матэрыялы Капітула Літоўскай правінцыі Ордэну кармелітаў босых. Гісторыка-архіўная даведка да фонду не дае дакладных звестак аб тым, якім чынам дакументы справаводства кармеліцкіх кляштараў трапілі ў бібліятэку. У прыватнасці, у ёй занатавана невялікая інфармацыя, аб тым, што частка матэрыялаў прывезена па выніках экспедыцыі з былога Надвілейскага дэканата, а таксама набыта ў прыватных асоб у 1983–1984 гг. (пры гэтым, прозвішчы асоб не ўказаныя) [1, арк. 9].

Па тыпавідавых прыкметах гістарычныя крыніцы, якія складаюць комплекс пакармеліцкіх кляштараў, адносяцца да матэрыялаў справаводства. Гэта службовая перапіска; уваходныя даручэнні цывільных і касцельных уладаў; рапарты; справаздачы; інструкцыі; выпіскі з вячыстых гродскіх кніг і кніг губернскіх праўленняў па маёмасных спрэчках; усемажлівыя ведамасці і маёмасныя рэестры. Невялікую колькасць матэрыялаў складаюць перачні богаслужэнняў [2; 3, арк. 1-2], інвентары і візітацыі [4; 5]. Дадзеная тыпавідавая характарыстыка пэўным чынам пралівае святло на прычыны, паводле якіх памянёны комплекс дакументаў адлажыўся ў ЦНБ НАН Беларусі. Паводле беларускага савецкага архіўнага заканадаўства, падобныя гістарычныя крыніцы адносіліся да трэцяй (найменшай) катэгорыі каштоўнасці, ці наўпрост знішчаліся як каштоўнасці не маючыя. Прыкладам падобных адносін да дакументаў могуць служыць масавыя мукулатурныя кампаніі, якія праводзіў Цэнтральны гістарычны архіў БССР (зараз – НГАБ) у 1945–1980-ых гг. Так, было знішчана 29 адзінак захавання Рагачова-Быхаўскага дэканата, сярод якіх былі выключна комплексы матэрыялаў, пералічаныя вышэй [6, арк. 4-7]. Такім чынам, можна зрабіць вывад, што ў бібліятэку па рэштавым прынцыпе трапілі толькі тыя дакументы, якія не ўяўлялі каштоўнасці для дзяржаўнай архіўнай сістэмы і былі пакінуты ў касцёлах, пасля чаго іх выкупілі прыватныя асобы ці сама бібліятэка.

Дадзеныя звесткі можна пацццвердзіць канкрэтным прыкладам. У НГАБ на захаванне трапіла 38 адзінак з бялыніцкага кляштару, сярод якіх матэрыялы



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

па рамонце касцёла, інвентары, спісы парафіян, метрычныя кнігі [7]. У дадатак да гэтага тое, што на думку кляштарных кусташаў было найбольш цікавым і каштоўным, было вывезена ў правінцыйны ордэнскі архіў у Кракаў. Напрыклад, у Кракаве на сённяшні дзень апынуліся матэрыялы, датычныя цудадзейнага абраза Маці Божай Бялыніцкай за 1737–1756 гг. [8, арк. 1-16]. Як вынік, у ЦНБ захоўваюцца толькі тыя крыніцы, якія заставаліся ў Бялынічах па стане на 1980-я гг. – дакументы бягучага справаводства, у тым ліку копіі рапартаў [9, арк. 1-2адв.]. Тое ж можна казаць і пра гістарычныя крыніцы з іншых кляштараў, якія захоўваюцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы.

Не гледзячы на падобную нізкую ацэнку з боку савецкага архіваўнаўства ў дачыненні да матэрыялаў, трапіўшых у ЦНБ, можна гаварыць аб тым, што на сённяшнім этапе развіцця айчыннай гістарычнай навукі яны з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі ведаў па мікрагісторыі і гісторыі штодзённасці Беларусі. Так, побач з дастаткова статычнымі рапартамі і адпіскамі, выкананымі бюракратычнай мовай, статыстычнымі звесткамі аб колькасці манахаў, грашовых выдатках на іх утрыманне і г.д, занатавана каштоўнейшая інфармацыя пра голад у Беларусі ў 1830 г. [10, арк. 25-27адв.]; успышкі воспы ў 1821-1822 і 1831 гг. і ролю рымска-каталіцкага касцёла ў агітацыі да вакцынацыі [11, арк. 231-231адв.]; п'янстве і амаральных паводзінах асобных братоў ордэну [12, арк. 1-1адв.; 13]; вырабе і продажы кармелітамі алкагольных напояў; удзеле братоў ордэну ў паўстанні 1863-1864 гг. і ўкрыцці беглых жаўнераў у сваіх кляштарах; функцыянаванні ў розных населеных пунктах аптэк, якія размяшчаліся пры пакармеліцкіх кляштарах [14, арк. 2-11] і шмат інш. Пры падрабязным аналізе названых звестак і іх спалучэнні з роднаснай па сваёй прыродзе інфармацыяй (напрыклад, з іншымі звесткамі аб эпідэміі халеры ў 1830-1831 гг.), ствараецца ўзровень гістарычных ведаў, які можна назваць парафіяльнай штодзённасцю.

Такім чынам, комплекс гістарычных крыніц кармеліцкіх кляштараў, які знаходзіцца на захаванні ў ЦНБ НАН Беларусі, уяўляе з сябе сукупнасць дакументаў, якія аказаліся па пэўных прычынах непатрэбнымі савецкай дзяржаўнай архіўнай сістэме, а таксама правінцыйнаму архіву Ордэну кармелітаў. Тым не менш, улічваючы сённяшнія ўмовы развіцця гістарычнай навукі, памянёны комплекс з'яўляецца каштоўным матэрыялам па мікрагісторыі і гісторыі штодзённасці Беларусі. Дакументы, якія ён уключае ў сябе – гэта акты справаводства, якія мусяць выкарыстоўвацца выключна ў сукупнасці з тымі гістарычнымі крыніцамі, што адлажыліся ў іншых архівасховішчах.

## Літаратура

1. Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі). – Ф. 23. Б\в. Б\н. Гісторыка-архіўная даведка да вопісу.
2. ЦНБ НАН Беларусі. – Ф. 23. Воп. 1. Адз. Зах. 900.
3. ЦНБ НАН Беларусі. – Ф. 23. Воп. 1. Адз. Зах. 922.
4. ЦНБ НАН Беларусі. – Ф. 23. Воп. 1. Адз. Зах. 899.
5. ЦНБ НАН Беларусі. – Ф. 23. Воп. 1. Адз. Зах. 914–915.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2378. Б\в. Б\н. Справа фонду № 2378.
7. НГАБ. – Ф. 2380. Воп. 1. Спр. 1–38.
8. Archiwum Ojców karmelitów w Krakowie (AKKr). – Rkps. 177.
9. ЦНБ НАН Беларусі. – Ф. 23. Воп. 1. Адз. Зах. 943.
10. ЦНБ НАН Беларусі. – Ф. 23. Воп. 1. Адз. Зах. 880.
11. ЦНБ НАН Беларусі. – Ф. 23. Воп. 1. Адз. Зах. 938.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

12. ЦНБ НАН Беларусі. – Ф. 23. Воп. 1. Адз. Зах. 913.
13. ЦНБ НАН Беларусі. – Ф. 23. Воп. 1. Адз. Зах. 924.
14. ЦНБ НАН Беларусі. – Ф. 23. Воп. 1. Адз. Зах. 917.

УДК 94 (476): 282 “19”

# АКТИВИЗАЦИЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ РИМСКО-КАТОЛИЧЕСКОГО ОРДЕНА ТЕРЦИАРОВ И ТЕРЦИАРОК НА ЗАПАДНОБЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ В НАЧАЛЕ XX в.

**Табунов Василий Васильевич**
Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова
(г. Могилев, Беларусь)

*В статье анализируется активизация деятельности римско-католического ордена терциаров и терциарок на землях Западной Беларуси в начале XX в.*

В конце XIX – начале XX в. население белорусских земель являлось поликонфессиональным. Римско-католическое вероисповедание занимало второе место после православной церкви по численности верующих в белорусских губерниях. Согласно данным переписи 1897 г., на белорусских землях проживало 1 947 795 римо-католиков, что составляло около 23% от общего количества населения [1, с. 252–253].

Указ «Об укреплении начал веротерпимости» от 17 апреля 1905 г. в значительной степени способствовал активизации деятельности римско-католического костёла на белорусских землях. В первую очередь усилия римско-католического духовенства были направлены на пополнение рядов верующих. Их усилия, предпринятые в данном направлении, увенчались должным успехом. Только за 1905–1907 гг. согласно правительственным данным из православия в римо-католицизм здесь перешло 49 425 человек [2, с. 190].

В деле изменения своей религиозной принадлежности части населения белорусских земель в конце XIX – начале XX в. немаловажную роль сыграли представители римско-католического ордена терциаров и терциарок.

Сведения Министерства внутренних дел Российской империи о ордене терциаров и терциарок и его функционировании на восточнобелорусских землях в начале XX столетия проанализированы автором в научной статье [3, с. 157–159]. В данной работе будет рассмотрена деятельность римско-католического ордена на западнобелорусских землях, на которых численность римско-католического населения была более многочисленной, в силу чего действия, предпринимаемые членами ордена «Братьев покаяния» по укреплению позиций костёла, отличались больший активностью, чем на землях Восточной Беларуси.

Предписание Министерства внутренних дел о предоставлении сведений по деятельности терциарских братств в конце XIX столетия было направлено Виленскому генерал-губернатору, в ведении которого находились Гродненская и Виленская губернии с многочисленным представительством населения, исповедующим римо-католицизм.

26 октября 1898 г. Виленский генерал-губернатор предписал гродненскому губернатору сделать поручение полиции произвести сбор информации о суще-



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by